Падпіска-2007

**СА «ЗВЯЗДОЙ» — У НОВАЕ ПАЎГОДДЗЕ**

Ідзе падпіска на 3-і квартал і ІІ паўгоддзе 2007 года.
ПАДПІСНЫЯ ЦЭНЫ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА»
(У РУБЛЯХ, УСТАНОЎЛЕНЫ З 01.07.2007 Г.)

| Індэкс | на 1 месяц | на 3 месяцы | на 6 месяцаў |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 8200 | 24600 | 49200 |
| 63145 (індывідуальны льготны, для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны) | 7850 | 23550 | 47100 |
| 63858 (ведамасны) | 13000 | 39000 | 78000 |
| 63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя) | 11850 | 35550 | 71100 |

СПАДЗЯЁМСЯ НА ВАШУ ПАДТРЫМКУ, паважаныя падпісчыкі і работнікі паштовай сувязі.



*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

31 МАЯ 2007 г. ЧАЦВЕР

№ 99 (25964)

Кошт 350 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.


Увага

## Спякота правакуе

### масавыя трагедыі на вадзе

***Надзвычайная спякота, што назіраецца ў апошнія тыдні мая, прыцягвае людзей да вадаёмаў. Вельмі актыўна пачалі наведваць ракі і азёры жыхары нашай краіны для адпачынку менавіта ў выхадныя. Аднак часам вельмі вольныя паводзіны людзей каля «вялікай» вады прыводзяць да бяды...***

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» вядучы спецыяліст Рэспубліканскага таварыства ратавання на водах Віктар Харошка, толькі за мінулы тыдзень зарэгістравана 70 выпадкаў утапленняў, у тым ліку 14 дзяцей. Сапраўды чорнымі днямі сталі для краіны **мінулыя выхадныя, калі патанула амаль 36 чалавек.** Самая маштабная бяда наведала найбольш спякотны рэгіён краіны — Гомельскую вобласць, дзе ў мінулы тыдзень у вадзе загінула 22 чалавекі. У Мінскай вобласці за гэты час патанула 4 чалавекі.

Трэба адзначыць, што ў вызначаны перыяд у ахоўнай зоне выратавальных станцый і пастоў АСВОД было выратавана 48 чалавек і трагічных выпадкаў удалося пазбегнуць увогуле.

Большая частка загінулых (54 працэнты) сталі ахвярамі вады пры купанні, астатнія гінулі ў вадзе бытавых ёмістасцяў ці пры іншых абставінах. У прыватнасці, на выхадных група з 8 чалавек актыўна спажывала алкагольныя напоі на беразе Чыжоўскага вадасховішча. У 2 гадзіны ночы, пасля чарговай чаркі адзін з іх пайшоў асвяжыцца і патануў... Спецыялісты АСВОД адзначаюць, што каля 60 працэнтаў загінулых наведалі вадасховішчы пасля выпіўкі алкаголю. Беражыце сябе і сваіх дзяцей!

**Сяргей КУРКАЧ.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У мінулы аўторак, у другой палове дня ў Быхаве з маста сігануў мужчына. Цяпер вадалазы шукаюць яго цела. Верагодна, што ён проста хацеў скокнуць у ваду з вышыні, але такі ўчынак аказаўся цалкам падобным на самагубства.

Каторыя суткі не ўдаецца знайсці 29-гадовага мужчыну, які 27 мая з сябрамі палез купацца ў возера паблізу вёскі Забалацце Магілёўскага раёна. Уся кампанія была нецвярозая: пайшлі ў ваду чацвёра — выйшлі толькі трое. Кажуць, адзін вырашыў паплаваць больш, іншыя адгаворвалі, а ён не паслухаўся...

Паводле слоў начальніка вадалазна-выратавальнай службы Магілёўскага абласнога АСВОД Мікалая Луганцова, у Магілёве на беразе ракі знайшлі адзенне. Нібыта ёсць сведкі, што тут плаваў мужчына, але дзе ён цяпер — невядома, вядуцца пошукі.

Раней у Магілёўскім раёне знік рыбак — 40-гадовы мужчына. На месцы лоўлі рыбы засталіся яго рукзак і тры вуды. Цела рыбака шукалі доўга і знайшлі за 20 кіламетраў ад яго рэчаў. Што з ім здарылася — невядома, але чалавек патануў.

У Магілёве за май патанула больш за дзесяць чалавек. Сярод іх — трое непаўналетніх. «Звязда» пісала пра трагічны выпадак, калі на рацэ Днепр патанулі два 9-класнікі. Яшчэ адна трагедыя здарылася ў Горках: у сажалцы патануў 17-гадовы студэнт медвучылішча. Астатнія тапельцы — людзі розных узростаў, якія купаліся ў рэках і вадаёмах Чавускага, Круглянскага, Асіповіцкага, Магілёўскага і Касцюковіцкага раёнаў.

Выратавальнікі на вадзе яшчэ раз нагадваюць аб небяспеках першай вады: яе тэмпература на паверхні і ў глыбіні розніцца істотна, ад чаго могуць узнікнуць сутаргі і перабоі ў рабоце сэрца нават у здаровых людзей. Тым больш, калі чалавек смажыцца на сонцы ў самыя спякотныя гадзіны альбо прымае моцныя напоі. Нярэдка заканчваюцца трагедыямі і спрэчкі маладых людзей на здольнасць пераплыць альбо нырнуць. АСВОД заклікае людзей не рабіць глупстваў і забывацца на ўласную бяспеку на вадзе.

**Ілона ІВАНОВА.**


ISSN 1990-763X


## Праект указа аб адраснай сацыяльнай дапамозе — у трохмесячны тэрмін

**Праект указа аб адраснай сацыяльнай дапамозе ў Беларусі плануецца распрацаваць і прадставіць кіраўніку дзяржавы ў трохмесячны тэрмін. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі.**

Дакумент распрацоўваецца па даручэнню кіраўніка дзяржавы ў сувязі з працэсам упарадкавання сацыяльных льгот у краіне. Як адзначылі ў Адміністрацыі Прэзідэнта, ва ўказе будзе прапісаны дакладны, падрабязны, дэбюракратызаваны механізм прадастаўлення сацыяльнай дапамогі тым, каму яна сапраўды патрэбна. У дакуменце будуць вызначаны катэгорыі грамадзян, якія падпадаюць пад адрасную сацыяльную дапамогу, пералік прадастаўляемых льгот і прывілей, а таксама падставы для іх атрымання.

Праект указа будзе ўлічваць асноўнае патрабаванне Прэзідэнта — механізм прадастаўлення адраснай сацыяльнай дапамогі павінен быць празрысты, справядлівы і зразумелы для ўсіх.

## Вясковая святыня



— Крыніца наша невычэрпная і нават у трыццаціградусныя маразы не замярзае, — гаворыць жыхарка вёскі Будзішча Чачэрскага раёна Ганна Ермакова, зачэрпваючы каромыслам вядро сцюдзёнай вады. — Гэта наша святыня.
Ніхто дакладна не ведае, калі і з якімі падзеямі ці легендамі звязана ўзнікненне будзішчанскай крыніцы, але многія лічаць месца святым, пра што сведчаць ручнікі на старых збуцвелых крыжах. Бадай, падобнай па велічыні крыніцы-студні ў Беларусі не зарэгістравана.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«Гучныя» справы

## ШТО «НАХІМІЧЫЎ» КІРАЎНІК «БЕЛНАФТАХІМА»?

### Высокапастаўлены чыноўнік трапіў за краты

**Як паведаміў учора падчас сустрэчы з журналістамі Генеральны пракурор Беларусі Пётр Міклашэвіч, 29 мая супрацоўнікамі Камітэта дзяржбяспекі быў затрыманы старшыня канцэрна «Белнафтахім» Аляксандр Бароўскі. Яму інкрымінуюцца службовыя злоўжыванні і крадзяжы. Паводле слоў Пятра Міклашэвіча, апроч кіраўніка «Белнафтахіма» затрыманы і змешчаны ў следчы ізалятар КДБ таксама шэраг дзяржчыноўнікаў і прадстаўнікоў камерцыйных структур. У падазроных канфіскавана буйная сума грошай, каштоўныя рэчы і важныя дакументы.**

Пётр Міклашэвіч паведаміў і аб іншых «гучных» справах, якія зараз расследуюцца рэспубліканскай Пракуратурай. У прыватнасці, у поле зроку праваахоўных органаў у красавіку гэтага года трапілі двое судовых выканаўцаў з гаспадарчага суда сталіцы. Паводле звестак Генпракурора, служкі Феміды вымагалі ў камерсанта хабар у памеры 170 тысяч долараў. За гэтую суму судовыя выканаўцы абяцалі бізнэсмену аказаць садзейнічанне ў набыцці нерухомасці завода «Планар». Нядобрасумленных служачых злавілі за руку пры атрыманні 85 тысяч долараў.

Пракуратурай таксама расследуецца крымінальная справа, у якой фігуруе адзін з кіруючых работнікаў і некалькі шараговых супрацоўнікаў Нацыянальнага аэрапорта «Мінск». Яны падазраюцца ў спробе незаконнага вывазу за межы краіны норкавых шкурак агульным коштам 2,5 мільярда рублёў.

А вось былы першы намеснік Крупскага райвыканкама, які абвінавачваецца ў атрыманні хабару ў памеры 5,3 тысячы долараў за станоўчае вырашэнне пытання аб перадачы аб'екта незавершанага будаўніцтва прыватным асобам, неўзабаве апынецца на лаве падсудных. Крымінальная справа чыноўніка перададзена ўжо ў суд.

Пётр Міклашэвіч нагадаў, што ў гэтай карупцыйнай гісторыі фігуруе таксама намеснік старшыні праўлення Беларускага таварыства інвалідаў Аляксандр Гапееў. Гэтаму грамадскаму аб'яднанню, уласна кажучы, і належаў незавершаны аб'ект, які стаў прадметам «карупцыйнага гешэфту». За свае паслугі спадар Гапееў запатрабаваў хабар у памеры 529 тысяч долараў. У момант атрымання грошай нядобрасумленны кіраўнік быў затрыманы. Расследаванне гэтай крымінальнай справы, паводле слоў Пятра Міклашэвіча, набліжаецца да фіналу.

Увогуле, Генеральны пракурор запэўніў, што праваахоўныя органы будуць «спыняць карупцыйныя злачынствы, не зважаючы на чыны і рангі» парушальнікаў закона.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

### І ТАК БЫВАЕ! А МУЖА ПАШКАДАВАЛА...

**Мужчына запрасіў да сябе маладую дзяўчыну (жонка была на працы ў другую змену) і яны пасля застолля ляглі ў пасцель.**

Напэўна, выпілі мнагавата, бо заснулі і не пачулі, калі дамоў вярнулася гаспадыня. А тая, не доўга думаючы, узяла эсенцыю воцату і абліла ёю каханку мужа. Дзяўчына атрымала апёкі розных ступеняў амаль на палове цела, а вось на мужа і кропля не ўпала. Праваахоўнымі органамі г. Баранавічы ўзбуджана крымінальная справа.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

### ЗЛАЧЫНЦЫ АБАКРАЛІ НАСТАЎНІКАЎ

**Да дырэктара Прыборскай сярэдняй школы ў дом заявіліся няпрошаныя госці: злачынцы забралі грошы, што былі прызначаны для выплаты зарплаты работнікам школы.**

Больш за два тыдні таму а палове першай ночы праз акно ў дом да дырэктара залезлі двое нахабнікаў у масках, збілі гаспадыню, звязалі і забралі 8,9 мільёна рублёў. У ходзе аператыўна-пошукавых мерапрыемстваў устаноўлена, што злачынства ўчынілі мясцовы жыхар і гамяльчанін. Следства мае важкія падставы сцвярджаць, што ў хуткім часе яны будуць затрыманы.

**Аляксей ЦІТОЎ.**

### ЗАМЕСТ КАВЫ — ДОЛАРЫ

Адна работніца Вольнянскай бальніцы, што пад Баранавічамі, сваю валюту хавала на працы ў бляшанцы з-пад кавы. Магчыма, нехта зазірнуў у яе, шукаючы каву, а знайшоў 800 долараў. Цяпер тыя грошы шукае і міліцыя.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# Маленькі ўзрост. І большыя гарантыі?

У Беларусі пражывае больш як 2 мільёны дзяцей і падлеткаў ва ўзросце да 18 гадоў, што складае 21,3 працэнта ад агульнай колькасці насельніцтва краіны. Пры гэтым, на думку спецыялістаў, некаторае павышэнне паказчыкаў нараджальнасці, якое адбываецца зараз, можа працягнуцца, прынамсі, да 2010 года — менавіта да гэтага часу будзе назірацца рост колькасці жанчын у найбольш актыўным узросце 20—29 гадоў.

### Дапамогі з новай «планкі»

Не сакрэт, што павелічэнне колькасці моладзі можна назваць не больш чым някепскай «стартавай пляцоўкай». Для росту ж нараджальнасці патрэбны пэўныя стымулы. Так, нагадала намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна Шэметавец, ужо сёлета было прынята рашэнне аб прадастаўленні права на бясплатнае харчаванне дзецям ва ўзросце да 2 гадоў усім катэгорыям сем'яў з невысокім узроўнем даходаў, а таксама ўведзены дадатковыя льготы па падаходнаму падатку для шматдзетных сем'яў і сем'яў з дзецьмі-інвалідамі. Зараз у такіх сем'ях не абкладаюцца падаткам заробкі кожнага з бацькоў у памеры 4 базавых велічынь на кожнае дзіця ва ўзросце да 18 гадоў.

Адначасова мяркуецца павялічыць аднаразовыя дапамогі пры нараджэнні. Пры з'яўленні першага дзіцяці такая дапамога павінна ўзрасці да 5, а другога і наступных дзяцей — да 7 бюджэтаў пражытковага мінімуму. Прычым, паводле слоў Таццяны Шэметавец, не выключаецца варыянт, што гэтыя нормы «запрацуюць» ужо ў бліжэйшы час.

Не менш цікавы момант — новы парадак разліку штомесячных дапамог па догляду дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў. Вырашана, што з 1 студзеня 2008 года такія дапамогі павысяцца з 65 да 80 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму, а з 2009 года — выйдуць на адзнаку ў 100 працэнтаў БПМ. Да слова, 1 БПМ на сёння — гэта 179 100 рублёў.

І яшчэ. Як адзначыла Таццяна Шэметавец, самым «важкім» аргументам на карысць нараджэння дзіцяці для абсалютнай большасці сем'яў з'яўляецца наяўнасць уласнага жылля. У сувязі з гэтым зараз рыхтуюцца рашэнні па павелічэнню «спісанняў» льготных крэдытаў для шматдзетных, а таксама аб спісанні часткі камерцыйных крэдытаў для ўсіх катэгорый маладых сем'яў з непаўналетнімі дзецьмі. Праўда, заўважаюць у міністэрстве, казаць аб канкрэтных умовах падобнай «крэдытнай палёгкі» яшчэ рана.

### Ільготы знікнуць не ва ўсіх

Ці не найбольш папулярная тэма для размоў сёння — упарадкаванне льгот. Гэта закранула і сем'і з дзецьмі. У прыватнасці, з новага года павінна знікнуць норма аб прадастаўленні дзецям ва ўзросце да 3 гадоў бясплатных лекаў. Разам з тым, падкрэсліла намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па дэмаграфічнай бяспецы і сацыяльнаму развіццю Ала Ралькевіч, сродкі, што вызваляцца ў выніку «ільготнай рэформы», павінны пайсці перш-наперш менавіта на падтрымку дзяцей і ахову мацярынства.

Да таго ж, дзіцячыя льготы знікнуць не цалкам. Так, паведаміла Ала Ралькевіч, для дзяцей ва ўзросце да 7 гадоў захаваецца бясплатны праезд на ўсіх відах гарадскога і прыгараднага пасажырскага транспарту, бясплатны праезд у пасажырскіх цягніках і вагонах фарміравання Беларускай чыгункі, бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне па заключэнню ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі, санаторна-курортнае лячэнне з аплатай пуцёўкі ў памеры 15 працэнтаў ад яго кошту, для дзяцей-інвалідаў застанецца бясплатны праезд практычна на ўсіх відах грамадскага транспарту, а для дзяцей з сельскай мясцовасці — таксама бясплатны праезд ад месца жыхарства да школы і назад у пасажырскіх вагонах зноў-такі беларускіх цягнікоў.

### Аліменты з... пеняй

Адно з новаўвядзенняў апошняга часу — рашэнне аб вяртанні бацькамі сродкаў, што выдаткоўваюцца на ўтрыманне іх дзяцей у дамах-інтэрнатах. Казаць аб першых выніках тут можна ўжо зараз: летась, у параўнанні з 2005 годам, паказчык пазбаўлення бацькоўскіх правоў зменшыўся на 9 працэнтаў. Апроч таго, каля 200 няўдалых бацькоў здолелі аднавіць свае правы. А фактычна дзве трэці дзяцей, што патрапілі ў сацыяльныя прытулкі, вярнуліся ў свае сем'і.

Тым часам, паведаміў член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Ігар Карпенка, для большай абароны правоў дзяцей падрыхтаваны да разгляду ў першым чытанні праект закона, які прадугледжвае (у выпадку добраахвотнай дамоўленасці паміж бацькамі) магчымасць заключэння пісьмовага пагаднення аб утрыманні непаўналетніх дзяцей. Мяркуецца, што па такой дамоўленасці бацькі змогуць вызначаць памер аліментаў, што выплачваецца абодвума бакамі, самі — пры захаванні агульных гарантый.

Пры гэтым аліменты будуць вызначацца ў працэнтах да заробку і іншага даходу бацькоў, або ў нейкай канкрэтнай суме. Адно, што закон прадугледзіць: непасрэдна памер аліментаў павінен складаць як мінімум 1 базавую велічыню на кожнае дзіця.

Нарэшце, плануецца ўвесці эканамічную адказнасць за несвоечасовую выплату аліментаў. Інакш кажучы, зацвердзіць пеню ў памеры 0,3 працэнта ад сумы запазычанасці за кожны дзень пратэрміноўкі.

### Да педыятра — двойчы ў год

Літаральна месяц таму ў Беларусі ўведзена новая праграма дыспансэрызацыі. Паводле слоў галоўнага педыятра Міністэрства аховы здароўя Наталлі Галькевіч, зараз кожнае дзіця ці падлетак ва ўзросце да 18 гадоў павінен праходзіць агляд свайго педыятра двойчы ў год. А ў выпадку неабходнасці падобныя агляды будуць наладжвацца вузкімі спецыялістамі. Пры гэтым, паколькі здароўе дзіцяці заўсёды залежыць ад здароўя маці, у краіне ўкараняецца новая сістэма — гінекалагічная служба для дзяцей і падлеткаў.

Дарэчы, адзначыла Наталля Галькевіч, за апошні час у краіне ўдалося прыкметна знізіць смяротнасць сярод немаўлят. Аднак сітуацыя з больш старэйшымі дзецьмі падаецца больш праблемнай. Так, статыстыка сведчыць, што ў асноўным дзеці ва ўзросце пасля 4 гадоў пакідаюць жыццё па вельмі прыкрых прычынах — у выніку атручванняў, утапленняў, траўмаў, а таксама падзенняў з балкона.

**Сяргей ГРЫБ.**


**УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» СОВМЕСТНО С ИМНС ПО МОСКОВСКОМУ РАЙОНУ Г. МИНСКА**

**повторно проводят открытый аукцион**

***по продаже объекта незавершенного строительства – многоэтажного гаража, расположенного по адресу: г. Минск, пер. С. Ковалевской, д. 46 (восьмиэтажное каркасное здание с панельными стенами и кирпичными вставками). Начальная цена снижена и составляет – 1 481 706 040 рублей.***

Задаток в размере 5% от начальной цены объекта перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «Белпромстройбанк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Оплата объекта осуществляется в сроки, указанные в протоколе о результатах аукциона. Отвод земельного участка будет осуществляться в установленном порядке Минской городской землеустроительной и геодезической службой. Аукцион состоится 5 июля 2007 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 4 июля 2007 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6. Извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 27.03.2007.

**Телефоны для справок: (017) 227-48-36, 227-40-22.**



**УПРАВЛЯЮЩИЙ В ДЕЛЕ О БАНКРОТСТВЕ ГТПУП «ЗВЕЗДА» Г. БОРИСОВ, СОВМЕСТНО С КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»**

**ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже расположенных в военном городке «Печи», г. Борисов, ул. Серебренникова, объектов недвижимости и оборудования: **Лот № 1:** здание столовой № 1, об.пл. 1381 кв.м, земельный участок пл. 0,3431 га. Начальная цена – 467298360 бел. руб. с НДС. **Лот № 2:** кафе «Витязь», об. пл. 557 кв.м., со следующим имуществом: морозильник, фритюрница ECO – 6, витрина для бара, барная стойка с подсветкой, музыкальный центр Daewoo PRQ, набор корпусной мебели, капроновые шторы, диван-кровать угловой, диван от набора «Остап», картина зеркальная «Водопад». Земельный участок – 0,2641 га. Начальная цена – 253176552 бел. руб. с НДС; **Лот № 3:** свинарник, об.пл. 528 кв.м., земельный участок – 0,5197 га. Начальная цена – 27257288 бел. руб. с НДС. Задаток в размере 10% от начальной цены лота перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «Белпромстройбанк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть заключен в течение 10 дней после проведения аукциона. Переход права пользования земельным участком будет осуществлен по решению местного исполкома. Оплата за объект должна быть осуществлена в течение 30 дней со дня проведения торгов. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **5 июля 2007 г**. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 4 июля 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 322.

**Телефон (8017) 224-61-34.**

**Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.**


## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЛІТВА Ў СЛЕД ЗА ПОЛЬШЧАЙ І ЧЭХІЯЙ ЗАЯВІЛА АБ ГАТОЎНАСЦІ РАЗМЯСЦІЦЬ СІСТЭМЫ ПРА ЗША

**Літва зацікаўлена ў размяшчэнні на сваёй тэрыторыі проціракетных сістэм па прыкладу Польшчы і Чэхіі. Аб гэтым заявіў журналістам міністр абароны рэспублікі Юозас Олекас па выніках візіту ў Малдову.**

Олекас патлумачыў гэта пагрозай таго, што «праз некалькі гадоў у нестабільных краінах знойдуцца тэхнічныя магчымасці для атакі». «Свет павінен стрымаць гэты працэс. Адным з рашэнняў з'яўляецца проціракетная сістэма, якую прапануе НАТА», — сказаў міністр. Ён не пагадзіўся з меркаваннем, што ўстаноўка проціракетных сістэм у новых дзяржавах Еўрасаюза накіравана супраць Расіі і з'яўляецца першым крокам да новай халоднай вайны.

Аднак, нягледзячы на падобныя запэўніванні, Расія ўсё ж рыхтуецца адбіць магчымыя ўдары. Нагадаем, напярэдадні там паспяхова прайшлі выпрабаванні двух «адказаў на ПРА» — міжкантынентальнай балістычнай РС-24, галаўная частка якой раздзяляецца, і крылатай Р-500 для перасовачнага комплексу «Іскандэр-М». Паводле слоў першага віцэ-прэм'ера РФ Сяргея Іванова, у Расіі «з'явіліся новыя аператыўна-тактычны комплекс і стратэгічны комплекс», якія здольны пераадольваць «любыя існуючыя і будучыя сістэмы ПРА».

### ШЫМОН ПЕРЭС МАЕ НАМЕР СТАЦЬ ПРЭЗІДЭНТАМ ІЗРАІЛЯ



**Віцэ-прэм'ер Ізраіля лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру і наш зямляк Шымон Перэс афіцыйна аб'явіў аб вылучэнні сваёй кандыдатуры на пасаду прэзідэнта краіны, паведаміла The Jerusalem Post.**

Рашэнне Перэса падтрымалі ўжо прэм'ер-міністр Ізраіля Эхуд Ольмерт і выконваючая абавязкі прэзідэнта — спікер Кнесета Далія Іцык. Спікер назвала Перэса «лепшым кандыдатам» на гэту пасаду, а кіраўнік урада заявіў, што ён асабіста і ўся партыя «Кадзіма» будуць «працаваць без стомы» на перамогу цяперашняга віцэ-прэм'ера.

Паводле слоў самога Перэса, ён рашыўся на гэты крок «па шматлікіх просьбах». Ён лічыць, што зараз Ізраілю вострa неабходны чалавек, здольны аб'яднаць краіну, і ён гатовы такім чалавекам стаць. Аднак нават у правячай партыі многія сумняваюцца ў здольнасці Перэса сабраць дастатковую для перамогі колькасць галасоў дэпутатаў Кнесета. Многія лічаць, што Перэс проста вельмі стары для сямігадовага прэзідэнцкага тэрміну — у жніўні 2007-га яму павінна споўніцца ўжо 84 гады. Акрамя таго, сапернікі Перэса — Колет Авіталь (левая партыя «Авода») і Рэувен Рыўлін (правы «Лікуд») поўныя аптымізму адносна сваіх перспектыў на маючых адбыцца выбарах і гавораць, што ўжо заручыліся падтрымкай дэпутатаў з многіх парламенцкіх фракцый.

У Ізраілі прэзідэнта выбірае парламент краіны. Галасаванне, якое будзе тайным, прызначана на 13 чэрвеня.

### ВУЧОНЫЯ РЭКАМЕНДУЮЦЬ СПАРТСМЕНАМ НАТАЛЯЦЬ СМАГУ ПІВАМ

**Піва не толькі не проціпаказана спартсменам, але, наадварот, рэкамендавана. Ячменны напой ва ўмераных дозах дапамагае арганізму лепш спраўляцца з абязводжваннем і не адбіваецца на такіх паказчыках, як бачанне поля ці колькасць дапушчаных памылак. Да такой высновы прыйшлі эксперты ў галіне харчавання на сімпозіуме, які ў гэтыя дні праходзіць на поўдні Іспаніі.**

Сам форум, што адметна, мае знакавую назву: «Піва, спорт і здароўе». Практычна ўсе яго ўдзельнікі рэкамендавалі ўключыць бурштынавы напой у дзённы рацыён спартсменаў, падкрэсліўшы, што яго ўласцівасць замаруджваць ці папярэджваць акісленне арганічных злучэнняў карысна для сардэчна-сасудзістай сістэмы. За гэта гатовы паручыцца кардыёлаг і вядомы ў мінулым баскетбаліст Хуан-Антоніа Карбалан. На яго думку, піва выдатна дапамагае працэсу насычэння арганізма чалавека вільгаццю пасля інтэнсіўных фізічных практыкаванняў. Карбалан выступіў у падтрымку ідэі скасавання некаторых памылковых, паводле яго слоў, табу, што датычацца гэтага напою. Піва з'яўляецца другім асноўным напоем спартсмена пасля вады, пераканаены кардыёлаг.

Адпачынак

## МОРА І ГОРЫ — ЗА АДЗІНАЦЦАЦЬ ДЗЁН І ДЗЕСЯЦЬ НАЧЭЙ

**Калі «ЦэнтрКурорт» выбіраў стыль адпачынку ў новым беларускім комплексе ў пасёлку Чырвоная Паляна, які знаходзіцца пад горадам Сочы (канчатковая назва комплексу яшчэ не знойдзена, і дарэчы, на яе аб'яўлены ў Інтэрнэце конкурс), то была небяспека не дагадзіць звыкламу да лянівага пляжнага ляжання нашаму брату беларусу. Але рызыкнулі і, здаецца, не памыліліся. У грамадстве з'явілася ўжо дастатковая колькасць «новых» людзей — актыўных і патрабавальных, гатовых заплаціць грошы за добры сэрвіс і не сумны водпуск. Падобна на тое, што адпачынак у новым турыстычным аб'екце Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта будзе мецць попыт.**

— Перш за ўсё мы з вамі кажам не толькі пра комплексы, якія прапаноўвае Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта, а пра тую стратэгію развіцця турызму і актыўнага адпачынку, якая праводзіцца ў нас у Рэспубліцы Беларусь, — сказала журналістам, прадстаўляючы навінку, Галіна Забур'ялава, загадчыца сектара развіцця турызму Упраўлення ахоўных і прыродных комплексаў прыродакарыстання Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. — Наша краіна лічыцца турысцкай, яна дастаткова цікавая для іншаземцаў, мае нямала турыстычных аб'ектаў на сваёй тэрыторыі: гэта і нацыянальныя паркі, і санаторыі, і больш за сто вясковых сядзіб, якія гатовыя прыняць як беларусаў, так і гасцей з-за мяжы. Да ўсяго гэтага сёння дадаўся новы, унікальны і, на мой погляд, надзвычай цікавы аб'ект — комплекс у пасёлку Чырвоная Паляна на тэрыторыі Расіі. Гэта — горы, сонца, мора, чыстае паветра, дзіўны сэрвіс, архітэктура, інтэр'ер, цудоўная кухня, SPA-комплекс, басейн, магчымасць наведаць Каўказскі запаведнік. Я ўжо не кажу, што Чырвоная Паляна зараз усім вядома як прэтэндэнт на правядзенне зімовых Алімпійскіх гульняў у 2014 годзе. І незалежна ад таго, якое рашэнне прыме Міжнародны алімпійскі камітэт у чэрвені, гэтае месца ўжо набыло штуршок для імклівага развіцця. І тое, што там Беларусь мае свой аб'ект, а гэта ўласнасць нашай краіны, — яшчэ раз падкрэслівае, што мы валодаем вялікімі магчымасцямі.



Галіна Іванаўна запэўніла, што комплекс прыгодны для гурмана любога адпачынку. Ім, напрыклад, ужо зацікавіліся спартсмены. Наталля Цылінская марыць паехаць туды на зборы нацыянальнай каманды па веласпорту. Федэрацыя гарналыжнага спорту і сноўборда плануе ў Чырвонай Паляне працаваць і рыхтавацца да Алімпійскіх гульняў 2010 года. Але гэтае месца можа стаць улюбёным для кожнага.

Пра тамашнюю забаўляльную праграму на бліжэйшыя чатыры месяцы расказаў Алег Міхайлаў, начальнік Дзяржаўнай установы «ЦэнтрКурорт»:


*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

Адраджэнне вёскі

# ЛЕЛІКАВА БУДЗЕ ЖЫЦЬ!

З вёскай Лелікава Брэсцкай вобласці Кобрынскага раёна я была знаёмая даўно. Тым не менш, пачуўшы пра маштабныя змены, якія адбыліся ў гэтай глыбінцы, мне захацелася пабываць тут зноў. Зусім нядаўна Лелікава адкрыла новую яркую старонку ў сваёй гісторыі. Менавіта ў гэты дзень пра яе загаварылі на вядучых тэлеканалах краіны, радыё, напісалі многія газеты Беларусі. Адбылося адкрыццё тэніснага корта — першай у гісторыі нашай краіны сельскай федэрацыі тэніса. Жывая легенда сусветнага тэніса і заслужаны трэнер Марат Звераў, выдатныя беларускія тэнісісты Уладзімір Ваўчкоў і Вольга Барабаншчыкава, зорка беларускай эстрады Паліна Смолава, расійскі спявак Вадзім Казачэнка, ВІА «Лейся песня» — і гэта толькі малая частка знакамітых гасцей, якія прыехалі павіншаваць жыхароў Лелікава са святам. Такі падарунак падрыхтаваў для сваіх аднавяскоўцаў Іван Паўлавіч Панасюк да 468-годдзя вёскі. Ён імкнецца адрадзіць свой край. І, як мы бачым, робіць усё магчымае для гэтага. Варта адзначыць, што не кожны чалавек, дабіўшыся поспеху ў жыцці, дапамагае адраджаць родныя мясціны, сваю малую радзіму.

Убачыўшы гэты своеасаблівы аазіс у сельскай мясцовасці, прыходзіш у лёгкі шок. Думка толькі адна: «Няўжо ўся гэта прыгажосць знаходзіцца ў звычайнай беларускай вёсцы?!» Так, на шчасце, і такое бывае! Гэта збудаванне зроблена па новых тэхналогіях і адпавядае ўсім сусветным стандартам (выкарыстана сучаснае пакрыццё hart). На такім пакрыцці ў Мінску тэнісісты рыхтуюцца да спаборніцтваў самага высокага ўзроўню. Зоркі беларускага спорту Уладзімір Ваўчкоў і Вольга Барабаншчыка, апрабаваўшы новы корт, высока ацанілі яго якасць. «Уражаны ўбачаным, — сказаў знакаміты тэнісіст. — Радуе, што ў Беларусі з'явіліся першыя парасткі клубнага тэніса. Спадзяюся, што вельмі хутка пачнуць спаборнічаць адзін з адным айчынныя клубы, і ў нашай краіне з'явяцца новыя спартыўныя зорачкі». А Вольга Барабаншчыкава дадала: «Здорава! Нават у сталіцы нічога падобнага няма».

«Тэніс, як вядома, дарагі від спорту, — расказвае старшыня праўлення Кобрынскай раённай федэрацыі тэніса «Лелікава» Пётр Балка, — таму першапачаткова гэты корт задумваўся як гуманітарны, сацыяльны праект». Усё гэта задавальненне — бясплатна! Мячы, ракетка — усё ёсць у наяўнасці. Існуе толькі адна ўмова: добры спартыўны абутак. Кожны ахвотнік можа прыйсці і пагуляць у тэніс. І такіх нямала! Прыязджаюць з суседніх вёсак (Павіці, Дзівіна), з горада Кобрына і нават Брэста. Гэта толькі аматары. «Быў бы трэнер, было б значна прасцей ажывіць гэты корт, — гаворыць Пётр Мікалаевіч. — Нават дзеці з Кобрына просяцца займацца прафесійным тэнісам і, на жаль, пакуль мы вымушаны адмаўляць!» Для вясковых дзяцей тэнісны клуб — гэта радасць і гонар. Не ў кожнага гарадскога жыхара ёсць такая магчымасць. Корт ніколі не пустуе. І толькі зімой не заўсёды ўмовы надвор'я дазваляюць пагуляць у тэніс. З мясцовых дзяцей выбралі 10—12 больш адораных. З імі займаецца звычайны настаўнік фізкультуры. Аднак каб у вялікім тэнісе юныя спартсмены змаглі паказваць добрыя вынікі, трэба больш прафесійны падыход.

У вёсцы Лелікава плануюць праводзіць шмат спаборніцтваў: абласных, рэспубліканскіх, і магчыма, нават міжнародных. А дазвол на правядзенне спаборніцтваў міжнароднага ўзроўню ўжо ёсць! І каб такія грандыёзныя планы ўвасобіць у жыццё, Іван Паўлавіч Панасюк збіраецца пабудаваць яшчэ два крытыя тэнісныя корты і гасцініцу побач. «Адзін чалавек не можа зрабіць усё сам, — тлумачыць Пётр Мікалаевіч. — Каб пабудаваць спартыўную базу, трэба каласальная падтрымка дзяржавы!» Ды, як кажуць, адзін у полі не воін. Напрыклад, пачаць будаўніцтва гасцініцы было запланавана ў пачатку вясны. Аднак бюракратыя і тут нагадала аб сабе. На афармленне толькі адных дакументаў быў патрачаны цэлы год. Акрамя гэтага ўзнікае яшчэ энергетычная праблема: чым ацяпляць гэтыя збудаванні? Напрыклад, калі пабудаваць гасцінічны комплекс, не хопіць напружання нават для таго, каб уключыць чайнік! Акрамя таго, вёска не газіфікавана. На ўсё гэта інвестару пры вялікім жаданні трэба патраціць зусім немаленькую суму грошай і шмат часу. Зусім відавочна, што тут без увагі і дапамогі дзяржавы не абысціся.

Спорт, спаборніцтвы — гэта здароўе, зносіны. Нам трэба моцная і квітнеючая Беларусь. І гэта трэба пачынаць з глыбінак. Вёска павінна жыць! «Хацелася б прыцягнуць увагу да Лелікава», — з надзеяй гаворыць Пётр Балка.

Будоўля ў вёсцы працягваецца. Хацелася б верыць, што ўсё задуманае ўвасобіцца ў жыццё.

**Ірына ЛЯШКЕВІЧ.**

***ДАВЕДКА:***

***І.П. Панасюк жыве ў Новасібірску. Тут жа ўпершыню ў Расіі пабудаваў Храм у гонар беларускай святой Ефрасінні Полацкай.***

***У 2001 годзе з групай аднадумцаў у Новасібірску стварыў Беларускі культурна-асветніцкі цэнтр імя беларускай святой. Выбраны старшынёй праўлення БКАЦ.***

***За асветніцкую дзейнасць, прапаганду духоўнай спадчыны беларускага народа ў Расіі І.П. Панасюк быў узнагароджаны ў 2004 годзе медалём Францыска Скарыны, які яму ўручыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.***



Звязда-90: адваротны адлік

Да юбілею «Звязды» засталося 70 дзён

# «ВЫ ЗАХОЎВАЕЦЕ КАШТОЎНЫ ДАР — МАТЧЫНУ МОВУ»



Глыбока перакананы, што ў нашым жыцці ёсць пэўныя заканамернасці, рытмы, вяртанне да некалі бачанага, — таго, на што пэўным чынам адрэагавала душа. На пачатку 60-х гадоў мой бацька працаваў брыгадзірам і ўваходзіў у склад парткама саўгаса, таму выпісваў газеты. Аднак гэта былі не маскоўскія «Правда» або «Известия», а наша беларускамоўная «Звязда» і раёнка — «Уперад». Калі раённая ўспрымалася як сямейная газета: у раёне ўсе пра ўсіх ведалі, то «Звязда» была газетай, якая звязвала нашу вёску з далёкай сталіцай, з усёй рэспублікай. Яе шарм заключаўся ў тым, што яна была генератарам думак, абмеркаванняў, вострых дыскусій. У той час статус газеты быў надзвычай высокі, самае галоўнае — людзі верылі кожнаму яе слову.

Тады я нават і не марыў, а не тое што думаў, што некалі на старонках гэтай сталічнай газеты з'яўяцца мае артыкулы, але сталася так, што пасля вучобы ў інстытуце, аспірантуры, я застаўся працаваць у Мінску, пачаў займацца тым, чым некалі была багата напоўнена душа маёй роднай бабулі: песнямі, паданнямі, абрадамі. Яна лячыла людзей, ведала травы, замовы. Усё гэта выклікала ў маёй душы незвычайную павагу і гонар. Потым у сваім жыцці я сустракаў дзесяткі такіх жанчын — мудрых, разумных, сардэчных, выдатных знаўцаў народнай культуры. Ад іх чэрпаў веды і дзяліўся імі на старонках любімай газеты.

За апошнія два дзесяцігоддзі газета прайшла вельмі пакручасты шлях выжывання, аднак не здрадзіла людзям і сабе, хоць спакус, відаць, было багата. Газета захавала сваё аблічча, а таму і свайго чытача. Складваецца ўражанне, што сёння «Звязду» выпісваюць тыя, хто яе чытаў 20 і 30 гадоў таму. Калі на выхадныя прыязджаю ў сваю вёску, то бачу, як людзі дастаюць знаёмую газету і з павагай глядзяць на цябе — маўляў, чыталі і твае артыкулы. Гэта вельмі важна, што чытач давярае калектыву рэдакцыі, людзі называюць прозвішчы тых, хто пастаянна піша па адпаведнай тэматыцы, пры гэтым адзначаюць глыбіню разважанняў, уменне адстойваць сваю пазіцыю. У сваю чаргу газета жыве шырокім спектрам праблем грамадства і дзяржавы. Уся панарама жыцця рэспублікі перад вамі: палітыка, улада, эканоміка, жыццё беларускай глыбінкі. Радуе тое, што «Звязда» шмат увагі ўдзяляе праблемам беларускай культуры, як прафесійнай, так і народнай, адкрывае рубрыкі, вядзе вельмі патрэбныя старонкі хатняй энцыклапедыі. Асаблівую цікавасць выклікаюць «гарачыя» лініі, калі чытач можа задаць пытанне пра набалелае і атрымаць на яго задавальняючы адказ. Геаграфія тэлефанаванняў — яскравае сведчанне таму, што «Звязду» чытае і чакае ўся Беларусь». Рэдакцыя адказвае тым жа : журналісты часта высылаюць свае дэсанты ў самыя аддаленыя куточкі рэспублікі.

У сувязі з юбілеем хочацца пажадаць газеце і калектыву рэдакцыі заўсёды адчуваць пульс народнага жыцця, памятаць, што вы фарміруеце свядомасць нашых суайчыннікаў, захоўваеце самы каштоўны дар Бога — родную матчыну мову. Творчых вам пошукаў, плёну, шчырых лістоў у рэдакцыю, новых рубрык, шчаслівых сустрэч з цікавымі людзьмі. А каб усё гэта здзейснілася — веры, надзеі, любові і здароўя.

**Янка КРУК,**
**загадчык кафедры этнаграфіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат філалагічных навук.**

Экстрым

# «УЛАДАР ВЁСКІ»:

## першасны спалох сем'яў-удзельнікаў змяніўся спартыўным азартам

**Сёння, калі чытачы ўжо будуць трымаць у руках гэты нумар газеты, стане вядомым пераможца трэцяга этапу сямейнага сельскагаспадарчага праекта «Уладар вёскі», што праходзіць у Глыбоцкім раёне. Канкурсантам давядзецца спаборнічаць у майстэрстве па разбіранню тушкі птушкі (напэўна, з далейшым прыгатаваннем шашлыка). Этап гульні адбудзецца ў вёсцы Марцэбыліна — на базе ААТ «Глыбоцкая птушкафабрыка» (дырэктар Эдуард Цінкевіч). Судзіць спаборніцтва будзе брыгадзір цэха прадпрыемства Наталля Бялевіч.**

...Трэба сказаць, што ўдзельнікі гульні (напачатку было 11 сем'яў, потым да іх далучылася яшчэ адна) ужо крыху супакоіліся. Напярэдадні правядзення першага этапу ўсе былі занадта засяроджанымі, нават напалохальнымі. Арганізатарам давялося праводзіць своеасаблівы «аўтатрэнінг», маўляў, гэта толькі гульня, успрымайце ўсё, што з вамі адбываецца, як прыгоды, магчымасць займець новых сяброў. Удзельнікі гульні — людзі звычайных прафесій (майстар вытворчага навучання, кухар, сакратар, шафёр, бухгалтар, вайсковец, галоўны заатэхнік і г.д.), прычым палова сем'яў — гараджане, палова — вяскоўцы. Згодна з правіламі, у гульні могуць прымаць удзел маці, бацька і дзеці да 18 гадоў (хоць пераважаюць хлопчыкі і дзяўчынкі 6—8 гадоў). Ёсць сем'і, дзе выхоўваецца і па 3, і па 4 дзіцяці — як родныя, так і прыёмныя. Уся дзятва прымае актыўны ўдзел у спаборніцтвах, праўда, па большасці пакуль у ролях падтрымкі бацькоў. Але арганізатары не выключаюць, што ў далейшым для малых удзельнікаў праекта таксама будуць арганізаваны асобныя конкурсы — мастацкай самадзейнасці, малюнка.

...Першы этап («Рускае поле» (конкурс аратых) прайшоў у вёсцы Удзела на базе ААТ «За Радзіму» (старшыня гаспадаркі Пётр Вельб). Трэба было на час запрэгчы каня, узараць поле, пасадзіць бульбу, распрэгчы каня. Пераможцамі тут стала вясковая сям'я з СВК «Ломашы-Агра»: Маргарыта і Віктар Герасімёнак і іх дзеці Кацярына і Яўген. Яны атрымалі ганаровы тытул «Уладар поля» і складаную бытавую тэхніку ў якасці прыза ад гаспадаркі, на базе якой праходзіла спаборніцтва. Дарэчы, гэта адна з умоў правядзення гульні, падтрыманая адным з бакоў кіраўніцтва праекта — упраўленнем сельскай гаспадаркі і харчавання райвыканкама: самы актыўны ўдзел у конкурсах павінны прымаць тыя ці іншыя гаспадаркі ці арганізацыі раёна, яны ж уручаюць пераможцам каштоўныя падарункі — прызы. Адчувальную падтрымку аказваюць і «пярвічкі» БРСМ на кожным этапе. Не застаюцца ўбаку і «ветэраны» экстрэмальных гульняў — члены сямейнага клуба «Востраў разумення», пра які мы ўжо неаднойчы пісалі.

...Другі этап гульні «Сырадой» (конкурс даярак) адбыўся літаральна днямі. Прайшоў ён у вёсцы Дзеркаўшчына на базе ААТ «Канстанцінаў Двор» (старшыня Віктар Асон). Калі конь у першым этапе быў адзін на ўсіх, дык тут у кожнай сям'і была «свая» карова. Дарэчы, многія ўдзельнікі загадзя выязджалі ў гаспадарку, каб «пазнаёміцца» з жывёлінай, патрэніравацца. Каму даіць жывёлу — вырашалі ў кожнай сям'і асобна, таму ў выніку ў конкурсе спаборнічала палова даярак і палова даяроў. Пераможцам (з атрыманнем тытула «Уладар сырадою») стала ўжо знаёмая чытачам сям'я Герасімёнак. Яе члены нават на трэніроўкі не ездзілі, заявіўшы, што з ручной дойкай каровы справяцца і так. Што і пацвердзілі на конкурсе. Ад гаспадаркі ў якасці прыемнага «бонуса» сям'і была ўручана вялікая... вэнджаная свіння. Дарэчы, аб'ектыўна ўсе вясковыя сем'і (чаму тут здзіўляцца) у прайшоўшых конкурсах паказалі сябе з больш моцнага боку. Хоць канчаткова высновы рабіць зарана: адбыліся толькі тры этапы з васемнаццаці і наперадзе ўдзельнікаў праекта чакае яшчэ шмат выпрабаванняў. Напрыклад, у чэрвені пройдуць конкурсы «Вострая каса» і «Сенажаць», у ліпені — «Калінка-малінка» (па збору ягад), «Залатая рыбка» (конкурс рыбаловаў) і г.д. (праект разлічаны да восені). Хто ведае, якая сям'я і адкуль будзе мацнейшай за іншыя ў гэтых спаборніцтвах. Зрэшты, не чакаючы фіналу, ужо зараз усіх удзельнікаў можна назваць пераможцамі, паколькі ўсе яны ў выйгрышы — ад новых сяброў, цікавых зносінаў, разнастайнага адпачынку.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ЗРУЧНА І ХУТКА!

**Беларуская чыгунка пераводзіць у разрад хуткасных цягнікі, найбольш запатрабаваныя ў паўднёвым напрамку.**

Цяпер пасажыры змогуць хутчэй дабірацца ў Сімферопаль і ў Еўпаторыю — статус хуткасных прысвоены цягнікам № 129/130 Брэст—Сімферопаль, № 135/136 Мінск—Еўпаторыя, № 139/140 Мінск—Сімферопаль.

Скароціцца час у дарозе хуткаснага цягніка № 38/37 Мінск—Адлер. Яго маршрут памянялі — цяпер ён будзе праходзіць праз Украіну. У сувязі з гэтым адлегласць стане карацей на 542 кіламетры, а час у дарозе скароціцца на 15 гадзін 42 хвіліны. Усяго з уводам новага графіка руху на 2007—2008 гады час у дарозе скароціцца на маршрутах 75 цягнікоў.

**Вікторыя РАМАНАВА, «Мінск—Навіны».**

*Организация проводит открытые торги по упрощенной схеме на закупку*
**ИМПОРТНЫХ СВЕТИЛЬНИКОВ**
**Контактный т/факс 2-26-39-76.**

Еўра-2008

## ПУНТУС СПАДЗЯЕЦЦА НА ВАЛЬЯЖНАСЦЬ БАЛГАРАЎ

Кіраўнік асацыяцыі Беларуская федэрацыя футбола Генадзь Нявыглас выкарыстаў прыклад нашай хакейнай зборнай падчас падрыхтоўкі да чэмпіянату свету-2007 і параіў галоўнаму трэнеру футбольнай «нацыяналкі» Юрыю Пунтусу таксама знайсці спосаб з'яднаць сваіх падначаленых перад адборачным матчам з балгарамі. Праўда, Юрый Іосіфавіч карысную параду падтрымаў, але футбалістаў у цырк ці на пейнтбол, як хакеістаў, не павёў, а арганізаваў сямейны дзень.

— На сумесную вячэру каманды былі запрошаны жонкі гулякоў і іх дзеці, — расказвае настаўнік. — Браты Глебы ў нас пакуль халастыя, таму яны завіталі са сваімі сяброўкамі. Саша прывёў вельмі прыгожую дзяўчыну. Летам яны пажэняцца, бо адносіны ў іх сур'ёзныя.

Непасрэдна ў дзень матча трэнер павядзе сваю каманду ў царкву. Не проста свечку паставіць, а на цэлую службу. Гэта ўжо традыцыя. Падтрымкай усявышняга заручыцца не пашкодзіць, улічваючы, што сустрэча са зборнай Балгарыі стане ключавой для нашай дружыны, а на час гульні сіноптыкі прагназуюць дождж. Коўзкі мяч можа прыпаднесці не адзін сюрпрыз. «Не вельмі хочацца, каб быў працяглы дождж, — заяўляе Юрый Пунтус, — бо пры добрым надвор'і газон на «Дынама» ідэальны, а калі дождж...» Аднак не толькі сямейная вячэра і служба ў царкве павінны натхніць беларусаў на перамогу, упэўнены Юрый Пунтус. Вялікай падтрымкай будзе аншлаг на стадыёне.

Каб пазнаёміцца з сапернікамі, Юрый Іосіфавіч спецыяльна выязджаў на іх матч з албанцамі. «Мяне здзівіла, што балгары недаацанілі албанцаў, у першым тайме займаліся свавольствам, а ў другім ім ужо не хапіла ні часу, ні ўдачы, каб размачыць лік, — дзеліцца ўражаннем настаўнік. — Было б добра, калі б яны гэтак жа вальяжна паставіліся б і да нас». Наконт сустрэчы балгараў з люксембуржцамі Юрый Іосіфавіч заўважыў, што нашы сапернікі гулялі на вынік і перамога ім далася цяжка. На матчы з галандцамі быў дождж, таму цяжка было разабрацца ў тактычных тонкасцях.

Ці лічыць Пунтус станоўчым той факт, што ў двух матчах запар (2 і 6 мая) давядзецца гуляць з адной і той жа зборнай? У гэтым настаўнік бачыць плюс у творчым трэнерскім плане. Тым больш, што ў зборнай Балгарыі нядаўна змяніўся трэнер і гэта можа паўплываць на выступленне каманды, бо розныя трэнеры маюць розныя тактыкі і разуменне гульні.

**Ірына ПРЫМАК.**

## Пасольства Літвы ў Беларусі аптымізавала работу з беларускімі турфірмамі

**Колькасць акрэдытаваных пры пасольстве Літвы ў Беларусі турыстычных фірм зніжана з 56 да 40, але пры гэтым павялічана колькасць наведванняў пасольства кожнай фірмай (раней было 2 разы ў месяц, стала 1 раз у тыдзень), паведаміла саветнік дыпламатычнага прадстаўніцтва па консульскіх пытаннях Люда Кляймёнава.**

Гэта на думку сп. Кляймёнавай, прывядзе да паляпшэння працэсу выдачы віз. Акрамя сталічных арганізацый у гэту колькасць увайшлі рэгіянальныя турфірмы з Магілёва, Паставаў, Маладзечна, Віцебска, іншых гарадоў. Асаблівыя ўмовы прадастаўлены пасольствам для дзяржаўнай установы «Цэнтркурорт», што займаецца накіраваннем грамадзян Беларусі на санаторна-курортнае лячэнне ў санаторый «Беларусь» у горадзе Друскінінкай. «Гэта рашэнне было няпростае, але, улічваючы важнасць фактара, што выязджаюць на лячэнне і аздараўленне дзеці, дзеці з бацькамі і дзеці-інваліды ў суправаджэнні, пасольства ўзяло на сябе дадатковыя абавязацельствы», — сказала Люда Кляймёнава.

Цяпер консульскі аддзел пасольства Літвы ў Беларусі штодзень выдае каля 400—500 віз. У час летняга адпускнога сезона гэту колькасць плануецца павялічыць да 600.

**Кар. БЕЛТА.**

Рысы да партрэта палітыка

# ІАГАНЕС РАУ — ЧАЛАВЕК ВЕРЫ І СЛОВА

**У нашых СМІ жанр партрэта палітыка, прычым як айчыннага так і замежнага, а тым больш заходняга, з'ява рэдкая. Можа таму, што не часта выпадае нагода прадметна пазнаёміцца з дзейнасцю і спадчынай палітычных дзеячаў. І вось Мінскі міжнародны адукацыйны цэнтр імя Іаганеса Рау пры падтрымцы Міністэрства замежных спраў ФРГ наладзіў паездку групы беларускіх журналістаў па слядах жыцця выдатнага нямецкага палітыка, дзяржаўнага дзеяча, экс-прэзідэнта Германіі Іаганеса Рау.**



### Неабходная даведка

Ініцыятыва прысваення цэнтру імя І. Рау належыць беларускаму Міністэрству замежных спраў. Яго кіраўнік Сяргей Мартынаў гэту прапанову растлумачыў вялікім укладам І. Рау ў справу ўсталявання ўзаемаразумення і даверу паміж нашымі краінамі і народамі. Сёння Дом Іаганеса Рау ў Мінску (так яшчэ называюць адукацыйны цэнтр) — важны фактар беларуска-германскага супрацоўніцтва. Сярод прыхільнікаў палітычнага таленту І. Рау і мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт. Ён лічыць яго выдатным царкоўным дзеячам і таму адназначна падтрымаў прапанову МЗС.

### Палітычны доўгажыхар

У першыню аб І. Рау я пачуў каля 20 гадоў таму. У той дзень усе цэнтральныя савецкія газеты выйшлі з паведамленнем і са здымкамі на першай паласе аб сустрэчы генсека КПСС Л. І. Брэжнева і кандыдата на пасаду канцлера ФРГ І. Рау. Газеты пісалі, што іх гутарка прайшла ў шчырай, добразычлівай і канструктыўнай атмасферы. Гэта азначала, што ў Крамлі моцна разлічвалі на паляпшэнне адносінаў з ФРГ у выпадку перамогі І. Рау. Але ён тады ў 1987 годзе прайграў выбары Гельмуту Колю, аднак з вялікай палітыкі не сышоў і яго прозвішча я потым нярэдка сустракаў у міжнародных навінах.

Цяпер вось выпала магчымасць напрамую спытаць у тых, хто тады быў побач з І. Рау, аб прычынах яго паражэння на выбарах. Калектыўны адказ быў такі: І. Рау як асоба і палітык вылучаўся на фоне іншых прагных да ўлады дзеячаў у першую чаргу непрыняццем сённяшніх правілаў палітычнай гульні.

Прайграў І. Рау і таму, што не атрымаў неабходнай падтрымкі з боку сваёй партыі. Там далёка не ўсім падабаўся сумленны і неардынарны палітычны стыль І. Рау весці барацьбу за галасы выбаршчыкаў, яго нежаданне ісці на здзелкі і дамоўленасці, якія пярэчылі яго жыццёвым прынцыпам і хрысціянскай маралі. Так, ён быў бясспрэчны фаварыт у зямлі Паўночны Рэйн-Вестфалія і некаторых іншых рэгіёнах, але гэта ўсё ж не ўся Германія. Але каго шануюць у Паўночным Рэйне-Вестфаліі, таго паважаюць і ў Берліне, сталіцах іншых земляў і дзяржаў. Невыпадкова на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў І. Рау быў адным з самых уплывовых палітыкаў краіны. А з 1999 па 2004 г. — ён федэральны прэзідэнт Германіі.

### Жорсткі напамінак

Андрэас Цыглер, сябра маладосці І. Рау, расказаў нам, што аднойчы ў сціплым бацькоўскім доме пратэстанцкага прапаведніка ў пакоі Іаганеса заўважыў на тумбачцы побач з ложкам фота афіцэра, калі не памыляюся, палкоўніка СС. А. Цыглер адразу пазнаў яго: гэта быў сумна вядомы эсэсаўскі ўрач-кат, пад кіраўніцтвам якога ў канцлагеры Асвенцім праводзіліся жудасныя медыцынскія эксперыменты над людзьмі.

— Навошта гэта табе? Як ты можаш пачынаць і заканчваць дзень з ім? — спытаў шакіраваны ўбачаным А. Цыглер. Адказ ён запомніў на ўсё жыццё: гэта штодзённы напамінак аб той катастрофе, што нядаўна здарылася ў Германіі.

І. Рау заўсёды быў непрымірымым, непахісным антыфашыстам. Яшчэ ў дзяцінстве ён стаў сведкам так званай «хрустальнай ночы», калі нацысты арганізавалі масавыя пагромы яўрэяў. На вачах Іаганеса была спалена сінагога. На сямігадовага хлопчыка тыя падзеі зрабілі моцнае ўражанне. Потым у дарослым жыцці ён стаў адным з самых уплывовых і перакананых прыхільнікаў прымірэння немцаў з народамі, якія пацярпелі ад фашыстаў. Адной з яго спраў стала ўсебаковае садзейнічанне будаўніцтву новай сінагогі ў Вупертале замест спаленай нацыстамі.

І. Рау стаў першым буйным палітыкам ФРГ, які вырашыў рызыкнуць выступіць на нямецкай мове ў кнесеце — ізраільскім парламенце. Напярэдадні сябры і таварышы па партыі не раілі рабіць гэтага. Нават некаторыя дэпутаты кнесета, якія асабіста ведалі і паважалі І. Рау, адгаворвалі яго, прадказвалі бурную абструкцыю і знявагу. Яны папярэджвалі: як толькі з яго вуснаў загучыць нямецкая мова, многія дэпутаты пакінуць залу. Аднак І. Рау прыляцеў у Тэль-Авіў і ўзняўся на парламенцкую трыбуну. Сапраўды, некалькі дэпутатаў дэманстратыўна выйшлі. Але пераважная большасць засталася. Тое, што яны пачулі, іх уразіла і кранула. І. Рау папрасіў прабачэння дзеля агульнай будучыні дзяцей Ізраіля і Германіі. І. Рау гаварыў настолькі пераканаўча і шчыра, што дэпутаты праводзілі яго апладысментамі.

### Насуперак бар'ерам

Працэс прымірэння з былымі рэспублікамі Савецкага Саюза пачаўся пазней, чым з іншымі краінамі Еўропы. Беларусь, паводле слоў яго сяброў і паплечнікаў, займала асаблівае месца ў сэрцы І. Рау. У многім дзякуючы яму былі ўстаноўлены першыя кантакты паміж нашай краінай і зямлёй Паўночны Рэйн-Вестфалія. Сімвалічна, што гэта адбылося 22 чэрвеня 1991 года — на 50-годдзе нападу фашысцкай Германіі на СССР.

Як прэм'ер-міністр урада зямлі ён напрыканцы 90-х гадоў наведаў Беларусь. Сустрэўся з Аляксандрам Лукашэнкам, удзельнічаў у розных мерапрыемствах, у прыватнасці, заклаў камень на месцы будаўніцтва будучага Міжнароднага адукацыйнага цэнтра. Даўні сябра і паплечнік І. Рау Герберт Шнор успамінае, што на той час двухбаковыя адносіны насілі давяральны і дзелавы характар. Здаралася, прадстаўнікі ўрада нашай краіны, яе пасольства ў ФРГ, за вырашэннем той ці іншай праблемы звярталіся ў канцылярыю І. Рау, а не ў ведамства федэральнага канцлера ці ў МЗС. І зямельныя ўлады дапамагалі. Хоць тады кантакты паміж зямлёй і Беларуссю актыўней развіваліся не па афіцыйнай, а па грамадскай лініі. І. Рау ўсяляк падтрымліваў намаганні народнай дыпламатыі, заахвочваў дзейнасць неўрадавых арганізацый, якія працавалі з беларускімі партнёрамі над ліквідацыяй наступстваў чарнобыльскай катастрофы.

.— Мы часта размаўлялі з ім аб Беларусі і пасля таго, як І. Рау стаў прэзідэнтам. Пасля маёй чарговай паездкі да вас ён падрабязна распытваў мяне аб уражаннях, назіраннях, хоць атрымліваў інфармацыю з МЗС, успамінае Г. Шнор.

Цікавай і паказальнай была рэакцыя І. Рау на незадаволенасць значнай часткі неўрадавых арганізацый недастатковай, на іх погляд, дапамогай Беларусі з боку Германіі. І. Рау запрасіў іх прадстаўнікоў да сябе. І многія пытанні былі зняты, пасля гэтай сустрэчы была распрацавана праграма садзейнічання нашай краіне. З таго часу было рэалізавана больш за 140 сумесных праектаў у розных сферах, напрыклад адукацыі, экалогіі.

І. Рау бачыў у пашырэнні стасункаў з нашай краінай важны накірунак агульнаеўрапейскай дзейнасці па ліквідацыі бар'ераў на кантыненце паміж Усходам і Захадам. Як расказала нам Крысціна Рау, жонка І. Рау, меў намер сур'ёзна пагутарыць з Уладзімірам Пуціным аб лёсе Беларусі, але, на жаль, такога выпадку не было.

### Урокі маладосці

У палітыку І. Рау пайшоў для таго, каб паспрабаваць змяніць свет у лепшы бок. Ён быў чалавекам хрысціянскай веры і трывалых перакананняў у тым, што дабро павінна перамагаць. Удзел у палітычным жыцці даваў, лічыў ён, шанц дапамагаць людзям згуртавацца дзеля высакародных мэтаў.

Першы раз І. Рау выбіраўся ў ландтаг зямлі Паўночны Рэйн-Вестфалія (па-нашаму — абласны парламент) ад малавядомай партыі. Шанцы прайсці былі мінімальныя. Але, як гэта нярэдка бывае, яму моцна дапамог яго вялікасць выпадак. Малады кандыдат тады на сустрэчы з выбаршчыкамі ездзіў на грамадскім транспарце. І вось аднойчы ў чаканні аўтобуса на адзін з перадвыбарных сходаў у невялікі сельскі гарадок ён набыў на вакзале мясцовую газету з багатым статыстычным матэрыялам аб жыцці тамтэйшых фермераў. І. Рау тады захапляўся трэніроўкай памяці і ў якасці практыкавання вывучыў асноўныя лічбы і факты з газеты. І так здарылася, што на сустрэчу з ім прыйшлі пераважна тыя, пра каго ішла размова ў публікацыі.

Тэмай выступлення кандыдата была заяўлена праблематыка еўрапейскай бяспекі. Пра яе І. Рау казаў не шмат, а засяродзіўся на паўсядзённым жыцці тых, хто сабраўся ў зале. Яны былі прыемна здзіўлены глыбокім веданнем маладым чалавекам іх складанай сітуацыі, цяжкасцяў са збытам гатовай прадукцыі. І. Рау настолькі ўдала апераваў газетнымі лічбамі і фактамі, што схіліў выбаршчыкаў на свой бок. Пасля выбрання ён выканаў дадзеныя на той сустрэчы абяцанні. З гэтага часу пачынаецца яго палітычная кар'ера. Ён становіцца самым маладым дэпутатам ландтага.

У тую сваю першую перадвыбарную кампанію І. Рау засвоіў: з людзьмі трэба размаўляць на іх мове, гаварыць ясна і зразумела, пазбягаць папулісцкіх лозунгаў і метадаў, быць скупым на абяцанні. Ён неаднойчы нагадваў маладым палітыкам: трэба рабіць тое, што сказаў і гаварыць пра тое, што зрабіў. І. Рау як кіраўнік высокага рангу імкнуўся пазбягаць загадаў, заўсёды спачатку шукаў кансенсус, шукаў магчымасці пераканаць людзей у правільнасці сваіх падыходаў і ідэй. Відаць, таму І. Рау на працягу больш чым 40 гадоў запар выбіраўся членам ландтага і 20 гадоў узначальваў урад самай развітай, вялікай па колькасці насельніцтва і ўплывовай зямлі Паўночны Рэйн-Вестфалія.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**
***(Заканчэнне будзе.)***

аўта аматар

Рубрыку вядзе Мікола ДЗЯБЁЛА.

### Аўтадарогі

#### ЛЕТНІЯ АБМЕЖАВАННІ

З першага чэрвеня і да канца лета на магістралях рэспубліканскага значэння будуць дзейнічаць абмежаванні для цяжкавагавага транспарту.

У прыватнасці, пры тэмпературы вышэй за 25 градусаў грузавікі з нагрузкай на адзіночную вось больш за 6 тон змогуць рухацца па памянёных дарогах толькі ў перыяд з 22 да 10 гадзін. У астатні час сутак вадзіцелям такіх транспартных сродкаў давядзецца адпачываць у цянку.

### Аўтасалон

#### НАРОД СКАЗАЎ СВАЁ СЛОВА

Падведзены вынікі мінскага міжнароднага аўтасалона «Мотаршоў». Паводле звестак арганізатараў, сёлета аўтасалон наведалі амаль 50 тысяч чалавек, якія шляхам галасавання вызначылі самыя папулярныя машыны, прадстаўленыя на «Мотаршоў». Такім чынам, на першым месцы па выніках народнага галасавання апынуўся аўтамабіль «Audi R8», на другім — «Chevrolet Corvette», на трэцім — «BMW X5».

Між іншым, арганізатары «Мотаршоў» рыхтуюць у Беларусі новы аўтасалон, прысвечаны ўсюдыходам. Выстава пад назвай «Off Road Minsk» запланавана на верасень гэтага года.

### Аўтапрагноз

#### МАКСІМУМ ПЕРАСЦЯРОГІ

Інтэнсіўнасць руху на ўсіх магістралях дасягнула максімальнай рысы. Таму, каб прадухіліць аварыі, звычайных мераў перасцярогі будзе недастаткова. Вадзіцелі павінны ўмець імгненна рэагаваць на нечаканыя змены хуткасці іншых удзельнікаў руху, а таксама на раптоўныя манеўры калегаў. Неабходна мець на ўвазе, што пачаліся канікулы, а значыць, на вуліцах і дарогах з'явілася больш дзяцей і падлеткаў.

**31 мая** небяспечныя сітуацыі могуць узнікнуць нават на роўным месцы і там, дзе іх цяжка прадугледзець. Таму асобам, у якіх дзень пачнецца з паломкі тэхнікі, лепш адкласці паездку. Вялікая верагоднасць сутыкнення аўто з пешаходамі ў цёмны час сутак. Пешаходам найлепшы спосаб прадухіліць такое здарэнне — начапіць флікеры.

**1 чэрвеня** рэкамендуецца прысвяціць больш увагі дзецям. Небяспечныя сітуацыі для сябе і іншых могуць стварыць пешаходы. Напрыканцы сутак вінoўнікамі аварый могуць стаць вадзіцелі, якія дрэнна пераносяць спякоту і маюць праблемы са здароўем.

**2 чэрвеня** надзвычай пільным трэба быць на ўчастках дарог з інтэнсіўным рухам і ў месцах масавага збору людзей. У цёмны час сутак на гарадскіх вуліцах і вясковых дарогах аварыйныя сітуацыі могуць стварыць нецвярозыя пешаходы і «дальнабойшчыкі».

**3 чэрвеня** вельмі верагоднае сутыкненне на дарозе з жывёламі. Пры перасячэнні перакрыжаванняў дарог важна выконваць устаноўленую правіламі чарговасць праезду. На перакрыжаваннях магчымыя аварыі, але без моцных пашкоджанняў людзей і транспарту.

### Аўтапрам

#### «ТАТА» РОБІЦЬ ГРОШЫ З ПАВЕТРА

Індыйская кампанія Tata Motors прадставіла першую ў свеце камерцыйную мадэль аўтамабіля, які працуе на сціснутым паветры.

Арыгінальная навінка пад назвай «CityCAT» здольная рухацца з максімальнай хуткасцю 109 кіламетраў у гадзіну. Аднаго балона, коштам усяго 2,2 долара, хопіць на тое, каб праехаць 200 кіламетраў.

Плануецца, што ўжо ў сярэдзіне наступнага года з канвеера сыдуць 6000 "паветрамабіляў". Кошт аднаго такога транспартнага сродку складзе 12 700 долараў. Цікавасць да незвычайнага аўто праявілі ў 12 краінах свету.

### Аўтарэкорд

#### НУМАР НА МІЛЬЁНЫ

На аўкцыёне ў Абу-Дабі ўстаноўлены рэкорд па кошту аўтамабільнага нумара. Мясцовы алігарх набыў за 6,9 мільёна долараў нумар, у якім толькі адна лічба «5». Вялікі кошт памянёнага нумара тлумачыцца тым, што ў арабаў пяцёрка лічыцца шчаслівай лічбай. Між іншым, уладальнік запаветнага нумара можа карыстацца ім пажыццёва і нават перадаць яго нашчадкам. Паводле мясцовых законаў, рэгістрацыйныя нумары набываюцца на ўсё жыццё, іх можна чапляць на кожны новы аўтамабіль.

**Калектыў газеты «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні супрацоўніцы рэдакцыі Валянціне ШПІЛЕЎСКАЙ у сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — трагічнай гібеллю сына ВІКТАРА.**

**Супрацоўнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне галоўнаму спецыялісту аддзела па забеспячэнню дзейнасці Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы БАГДАНАВАЙ Людміле Сцяпанаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

## Сёння

### Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.46 | 21.29 | 16.43 |
| Віцебск — | 4.28 | 21.26 | 16.58 |
| Магілёў — | 4.36 | 21.19 | 16.43 |
| Гомель — | 4.41 | 21.07 | 16.26 |
| Гродна — | 5.03 | 21.43 | 16.40 |
| Брэст — | 5.12 | 21.35 | 16.23 |

### Месяц

*Поўня 1 чэрвеня.*
*Месяц у сузор'і Стральца.*

### Імяніны

*Пр. Аляксандры, Фаіны, Хрысціны, Юліі, Андрэя, Багдана, Давыда, Дзяніса, Паўла, Пятра.*
*К. Ангеліны, Камілы, Марыі, Марыеты, Ксаверыя, Лявона, Фелікса.*

По звестках Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы БДУ

**Прагнозныя значэнні УФ-індэкса для г. Мінска і Мінскай вобласці на 31.05.2007**

| | |
|---|---|
| Экстрэмальны | 11+ |
| Вельмі высокі | 8—10 |
| Высокі | 6—7 |
| Умераны | 3—5 |
| Нізкі | 1—2 |

Для бязвоблачнага неба — UV INDEX 6,0

З улікам прагназуемай воблачнасці — UV INDEX 3,0

З **11** да **15** гадзін дня — час бяспечнага знаходжання на сонцы для людзей з адчувальным тыпам скуры — **20 мінут**.

## Надвор'е на заўтра




Няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

## ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА | +27 — +29 °C | дождж |
| ВІЛЬНЮС | +25 — +27 °C | дождж |
| КІЕЎ | +28 — +30 °C | Без ападкаў |
| МАСКВА | +25 — +27 °C | Без ападкаў |
| РЫГА | +13 — +15 °C | дождж |
| С-ПЕЦЯРБУРГ | +12 — +14 °C | Без ападкаў |

## УСМІХНЕМСЯ!

Жонка — палюбоўніку:
— Давай, хутчэй лезь у шафу — муж вярнуўся!
— Дык я ж там задыхнуся!
— Давай хутка! Яшчэ ніхто не задыхнуўся!

☺

**У школе:**
**— Ну, што тут у нас? Так, тэарэма аб ромбе. Ну, малюй ромб!.. Вовачка, ты што, не ведаеш, як выглядае ромб? Бубны, Вовачка, бубны! Вось так, малайчына, ідзі — тройка.**

☺

— Вы трымаеце дома жывёл?
— Так. Марожаную скумбрыю і крабавыя палачкі.

☺

**Навіны расійскага шоў-бізнэсу: учора спявачка Максім збіла спевака Іван.**

☺

Ён:
— У кіно былі, у парку былі, на дыскатэцы былі. Зараз куды?
Яна:
— У ЗАГС!

☺

**З Кнігі рэкордаў. Самую вялікую хуткасць можа развіваць танзанійскі бурундук. Але не жадае.**

**Сёння свой прыгожы юбілей адзначае наш калега і сябра намеснік галоўнага рэдактара «Звязды» Анатоль Аркадзьевіч СЛАНЕЎСКІ.**

Творчы шлях у «Звяздзе» Анатоль Аркадзьевіч распачынаў у 1991 годзе. Прычым абраў старэйшую штодзённую беларускую газету, якая выдаецца на нашай роднай мове, цалкам свядома. І вось сёння можна з упэўненасцю сцвярджаць, што «Звязда» стала і яго лёсам.

Шматгранны талент, нязменна высокая адказнасць за журналісцкае слова, арганізатарскія здольнасці дазволілі Анатолю Сланеўскаму прайсці ўсе прыступкі прафесійнай лесвіцы і па праву стаць адным з кіраўнікоў газеты. Падчас работы ў «Звяздзе» ў Анатоля Аркадзьевіча ў поўнай ступені праявіўся і яшчэ адзін талент — педагагічны. Многія сённяшнія журналісты справядліва лічаць сябе вучнямі Анатоля Аркадзьевіча і цвёрда ўпэўнены, што заўсёды могуць разлічваць на яго разуменне, прафесійную дапамогу і падтрымку. Таму не будзе перабольшваннем сказаць, што галоўны капітал Анатоля Аркадзьевіча — гэта шчырая павага сяброў і калег па «цэху».



З юбілеем! Асабістага шчасця, здароўя, творчага даўгалецця і вострага пяра!

**Звяздоўцы.**

# ПОЛАЦК ПОЙДЗЕ Ў ОПЕРУ

**Як жа не пайсці, калі да свята горада спецыяльна арганізаваны оперны канцэрт ля сцен старажытнага Сафійскага сабора?! «Шэдэўры сусветнага мастацтва» рыхтуюць салісты Беларускай оперы, хор і аркестр пад кіраўніцтвам дырыжора Андрэя Галанава.**

1 чэрвеня прывіды оперы паспрабуюць павярнуць палачан да сваёй веры. Канцэрт пачнецца а дзесятай гадзіне вечара. Нават славуты полацкі арган растрывожаць у позні час рукі полацкай арганісткі Ксеніі Пагарэлай, каб дзіўныя гукі «Ave Maria» пераканалі гараджан у цудадзейнасці ўсяго, што адбываецца. Цудам многія, пэўна, могуць палічыць і тое, што мастацтва, якое лічыцца адным з самых складаных для ўспрыняцця, насамрэч адкрытае і дэмакратычнае. Нават папулярнае. Многія пазнаюць вядомыя і знаёмыя мелодыі, якія прыемна напяваць сабе не горш за самы модны шлягер. І вось жывуць жа, трымаюцца ў «рэйтынгу» цэлыя стагоддзі!.. Прычым оперныя партыі яшчэ і спяваюць без аніякіх фанаграм, жывымі, непадробнымі галасамі. Артысты Беларускай оперы ўжо ведаюць, чаго вартыя такія канцэрты — ля муроў Мірскага замка спявалі, у Германіі ды Швейцарыі на летніх фестывалях на адкрытым паветры таксама выступалі. Пад адкрытым небам у Полацку будуць гучаць лепшыя галасы беларускай опернай сцэны — салістаў Уладзіміра Пятрова, Ніны Шарубінай, Сяргея Франкоўскага, Аксаны Волкавай, Алега Мельнікава, Аляксандра Кеды, Настассі Масквіной, Таццяны Гаўрылавай, Эдуарда Марытнюка, Алены Шведавай, Аксаны Якушэвіч. Артысты запрашаюць разам прычакаць апоўначы — а там будзе не проста прыгожы фінал, а вялікі феерверк. Спецыяльна для тых, хто сцвярджае, што ніякія прывіды оперы не запалохаюць, калі чакаеш сустрэчы з гэтым чароўным мастацтвам.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**


УТВЕРЖДЕНО
Наблюдательный Совет
АСБ «Беларусбанк»
21 мая 2007 г.
Протокол № 10

БЕЛАРУСБАНК 1922-2007 85 ЛЕТ

ЗАВЕРЯЮ
Начальник управления ценных бумаг Главного управления по г. Минску Министерства финансов Республики Беларусь
_______________В. Н. Омельянович
«30» мая 2007 года

## КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

## об открытой продаже облигаций двадцать шестого выпуска

## Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк», обеспеченных правом требования по кредитам, выданным на строительство, реконструкцию или приобретение жилья под залог недвижимости

**1. Наименование эмитента**
на белорусском языке:
полное: Адкрытае акцыянернае таварыства «Ашчадны банк «Беларусбанк»;
сокращенное: Акцыянерны Ашчадны банк «Беларусбанк» (ААБ «Беларусбанк»);
на русском языке:
полное: Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк»;
сокращенное: Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк» (АСБ «Беларусбанк»);

**2. АСБ «Беларусбанк» зарегистрирован** в Национальном банке Республики Беларусь 27 октября 1995 года. Регистрационный номер 56.

**3. Место нахождения эмитента, телефон, электронный адрес:** 220050, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Мясникова, 32. Телефон — (017) 218-84-08, телефон / факс — (017) 222-26-26. E-mail —info@belarus-bank.by

**4. Основные виды и срок деятельности эмитента**
В соответствии с законодательством Республики Беларусь, Общегосударственным классификатором видов экономической деятельности Республики Беларусь (код 65121 – деятельность коммерческих банков) и на основании Лицензии на осуществление банковской деятельности от 27 октября 2006 года № 1, выданной Национальным банком Республики Беларусь, АСБ «Беларусбанк» осуществляет следующие банковские операции:
- привлечение денежных средств физических и юридических лиц во вклады (депозиты);
- размещение привлеченных денежных средств от своего имени и за свой счет на условиях возвратности, платности и срочности;
- открытие и ведение банковских счетов физических и юридических лиц;
- открытие и ведение счетов в драгоценных металлах;
- осуществление расчетного и кассового обслуживания физических и юридических лиц, в том числе банков-корреспондентов;
- валютно-обменные операции;
- купля-продажа драгоценных металлов в случаях, предусмотренных законодательством Республики Беларусь;
- привлечение и размещение драгоценных металлов во вклады (депозиты);
- выдача банковских гарантий;
- доверительное управление денежными средствами по договору доверительного управления денежными средствами;
- инкассация наличных денежных средств, платежных инструкций, драгоценных металлов и иных ценностей;
- выпуск в обращение банковских пластиковых карточек;
- выдача ценных бумаг, подтверждающих привлечение денежных средств во вклады (депозиты) и размещение их на счета;
- финансирование под уступку денежного требования (факторинг);
- предоставление физическим и юридическим лицам специальных помещений или находящихся в них сейфов для банковского хранения документов и ценностей (денежных средств, ценных бумаг, драгоценных металлов и драгоценных камней и др.);
- перевозка наличных денежных средств, платежных инструкций, драгоценных металлов и драгоценных камней и иных ценностей между банками и небанковскими кредитно-финансовыми организациями, их обособленными и структурными подразделениями, а также доставка таких ценностей клиентам банков и небанковских кредитно-финансовых организаций.

Помимо банковских операций, указанных в части первой настоящего пункта, АСБ «Беларусбанк» вправе осуществлять в соответствии с законодательством Республики Беларусь:
- поручительство за третьих лиц, предусматривающее исполнение обязательств в денежной форме;
- доверительное управление драгоценными металлами и (или) драгоценными камнями;
- операции (сделки) с драгоценными металлами и (или) драгоценными камнями;
- лизинговую деятельность;
- консультационные и информационные услуги;
- выпуск (эмиссию), продажу, покупку ценных бумаг и иные операции с ценными бумагами;
- продажу лотерейных билетов;
- иную деятельность, предусмотренную законодательством Республики Беларусь.

Банк может осуществлять отдельные виды деятельности, перечень которых определяется законодательными актами Республики Беларусь, только на основании специального разрешения (лицензии).

Банк вправе осуществлять производственную и (или) торговую деятельность для собственных нужд, а также в случаях, предусмотренных законодательными актами Республики Беларусь.

Банк осуществляет следующие виды деятельности в соответствии с Общегосударственным классификатором видов экономической деятельности Республики Беларусь:
- страховое посредничество (деятельность страхового агента) (код 67201);
- сдача внаем собственного недвижимого имущества (код 702).

Срок деятельности АСБ «Беларусбанк» не ограничен.

**5. Основные показатели финансово-хозяйственной деятельности АСБ «Беларусбанк»:**

| *Показатели* | *2006 год* | *1 кв. 2007 года* |
|---|---|---|
| Прибыль, млн. руб. | 122 126,3 | 22 315,8 |
| Рентабельность, % | 10,1 | 5,7 |

**6. Объем эмиссии, количество и вид облигаций**
объем эмиссии — **30 000 000 000** (Тридцать миллиардов) белорусских рублей;
количество — **30 000** (Тридцать тысяч) облигаций. Серия **«АЫ»**, номера **«000001—030000»**;
вид – неконвертируемые именные процентные облигации в бездокументарной форме (в виде записей на счетах).

**7. Условия обеспеченности облигационного займа**
Облигации двадцать шестого выпуска АСБ «Беларусбанк» (далее – облигации) обеспечены обязательствами физических лиц по возврату основной суммы долга и уплате процентов по предоставленным АСБ «Беларусбанк» кредитам на строительство, реконструкцию или приобретение жилья под залог недвижимости, включенными (включаемыми) в соответствующий сформированный реестр данных обязательств, ведение которого осуществляет АСБ «Беларусбанк» в порядке, определенном законодательством Республики Беларусь.

Основная сумма долга по включенным в реестр обязательств по кредитам, выданным банком на строительство, реконструкцию или приобретение жилья под залог недвижимости, служащих обеспечением облигаций, составляет на 17.05.2007 г. 45 045 077 661 белорусский рубль.

АСБ «Беларусбанк» ведет реестр обязательств по кредитным договорам, служащих обеспечением облигаций, и обеспечивает установленный в части второй подпункта 1.1. пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28 августа 2006 г. № 537 «О выпуске облигаций банками» норматив соотношения объема находящихся в обращении облигаций размеру основной суммы долга обязательств по кредитным договорам.

**8. Номинальная стоимость облигаций**
Номинальная стоимость облигаций – 1 000 000 (Один миллион) белорусских рублей.

**9. Начальный срок открытой продажи облигаций**
Начальный срок первичной продажи облигаций: **01 июня 2007 года**.

**10. Место и время проведения открытой продажи облигаций**
Открытая продажа облигаций осуществляется в ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» и/или на внебиржевом рынке в соответствии с законодательством Республики Беларусь в течение 6 месяцев **с 01.06.2007 г. по 30.11.2007 г.** включительно, если больший срок не будет определен Правлением АСБ «Беларусбанк». Срок открытой продажи может быть сокращен в случае полной реализации всего объема эмиссии облигаций.

Для приобретения облигации юридические лица могут обращаться в филиалы-областные (Минское) управления, филиалы, центры банковских услуг и центральный аппарат АСБ «Беларусбанк». Отделения банка в размещении облигаций не участвуют.

АСБ «Беларусбанк» осуществляет продажу облигаций после согласования с Национальным банком Республики Беларусь выпуска облигаций, опубликования краткой информации об открытой продаже облигаций, заверенной Главным управлением по г. Минску Министерства финансов Республики Беларусь, которая публикуется АСБ «Беларусбанк» не позднее одного месяца с даты ее заверения.

Владельцами облигаций могут быть юридические лица – резиденты и нерезиденты Республики Беларусь в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

В день начала первичного размещения облигации размещаются по цене, равной номинальной стоимости.

Начиная со второго дня первичного размещения, покупатель также уплачивает сумму накопленного купонного дохода (НКД) за текущий купонный период с даты начала текущего купонного периода по дату фактической продажи, рассчитываемой по следующей формуле:

$$НКД = (K1*H*t1 + K2*H*t2 + .... + Kn*H*tn)/(365(366)*100)$$

где:
НКД – накопленный купонный доход;
t1, t2, tn – количество дней соответствующей части текущего купонного периода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной. При этом сумма t1 + t2 + ……+ tn должна быть равна количеству дней текущего купонного периода, истекших с даты начала текущего купонного периода;
K1, K2, Kn – процентная ставка по купону (процентов годовых) за соответствующую часть периода начисления купонного дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной, равная действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 1,5 (Один целый пять десятых) процентного пункта;
Н – номинальная стоимость облигации.

Расчет суммы накопленного купонного дохода по облигациям осуществляется исходя из фактического количества дней в году (365 или 366), проценты начисляются за каждый календарный день года.

Расчет накопленного купонного дохода производится по каждой облигации с округлением в соответствии с Правилами начисления процентов в банках Республики Беларусь, утвержденными постановлением Совета директоров Национального банка Республики Беларусь 29.12.2000 г. № 31.3г.

**11. Порядок оплаты облигаций**
Расчеты при размещении облигаций в ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» производятся в соответствии с регламентом расчетов в ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».

Юридические лица, изъявившие желание приобрести облигации на внебиржевом рынке, обязаны перечислить АСБ «Беларусбанк» денежные средства в безналичном порядке в соответствии с договором первичного размещения облигаций.

**12. Срок обращения облигаций**
Срок обращения облигаций составляет 24 месяца – **с 01 июня 2007 года по 31 мая 2009 года** (с учетом п. 18 настоящей краткой информации).

**13. Условия и размер выплаты дохода по облигациям и порядок его определения**
Выплата дохода по облигациям производится владельцам облигаций периодически **(один раз в три месяца)** в виде купонного дохода на основании реестра владельцев облигаций путем перечисления в безналичном порядке суммы купонного дохода на счета владельцев облигаций в белорусских рублях, открытые в уполномоченных банках Республики Беларусь. Реестр владельцев облигаций формируется за 5 рабочих дней до даты выплаты купонного дохода за соответствующий купонный период.

В случае, отсутствия в реестре владельцев облигаций данных о счетах владельцев облигаций в белорусских рублях, открытых в уполномоченных банках Республики Беларусь, а также в случае, если реестр содержит ошибочные банковские реквизиты, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на счете АСБ «Беларусбанк» до непосредственного обращения владельца облигации. Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.

График выплаты купонного дохода по облигациям:

| *Номер купона (процентного периода)* | *Начало периода* | *Конец периода* | *Продолжительность периода, дней* | *Дата выплаты дохода* |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 01.06.2007 | 31.08.2007 | 92 | 01.09.2007 |
| 2 | 01.09.2007 | 30.11.2007 | 91 | 01.12.2007 |
| 3 | 01.12.2007 | 29.02.2008 | 91 | 01.03.2008 |
| 4 | 01.03.2008 | 31.05.2008 | 92 | 01.06.2008 |
| 5 | 01.06.2008 | 31.08.2008 | 92 | 01.09.2008 |
| 6 | 01.09.2008 | 30.11.2008 | 91 | 01.12.2008 |
| 7 | 01.12.2008 | 28.02.2009 | 90 | 01.03.2009 |
| 8 | 01.03.2009 | 31.05.2009 | 92 | 01.06.2009 |

В случае, если дата выплаты купонного дохода выпадает на нерабочий день, выплата купонного дохода осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем. Проценты на сумму купонного дохода по облигациям за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются. Под нерабочим днем в настоящем решении считается нерабочий день центрального аппарата АСБ «Беларусбанк».

Первый купонный доход по облигации начисляется со дня начала купонного периода, в котором было произведено первичное размещение данной облигации, по день его истечения включительно (в том числе, если указанный день истечения является нерабочим днем).

Второй и последующие купонные доходы (включая последний) по облигации начисляются со дня начала очередного купонного периода по день истечения данного купонного периода (в том числе, если указанный день истечения является нерабочим днем). Дата окончания последнего купонного периода по облигациям – 31.05.2009 г.

Расчет купонного дохода производится путем его начисления на номинал облигации за купонный период, определенный в соответствии с вышеуказанными правилами, по процентной ставке, равной действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь с учетом ее изменения плюс 1,5 (Один целый пять десятых) процентного пункта.

Купонный доход рассчитывается по следующей формуле:

$$Д = (K1*H*t1 + K2*H*t2 + .... + Kn*H*tn)/(365(366)*100)$$

где:
Д – купонный доход;
t1, t2, tn – количество дней соответствующей части купонного периода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной. При этом сумма t1 + t2 + ……+ tn должна быть равна количеству дней в соответствующем купонном периоде;
K1, K2, Kn – процентная ставка по купону (процентов годовых) за соответствующую часть периода начисления купонного дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной, равная действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 1,5 (Один целый пять десятых) процентного пункта;
Н – номинальная стоимость облигации.

Расчет суммы купонного дохода по облигациям осуществляется исходя из фактического количества дней в году (365 или 366), проценты начисляются за каждый календарный день года.

Расчет купонного дохода производится по каждой облигации с округлением в соответствии с Правилами начисления процентов в банках Республики Беларусь, утвержденными постановлением Совета директоров Национального банка Республики Беларусь 29.12.2000 г. № 31.3г.

Выплата части купонного дохода не производится.

**14. Порядок выкупа облигаций в период их обращения**
АСБ «Беларусбанк» обязуется осуществлять досрочный выкуп облигаций у любого их владельца одновременно с выплатой дохода за первый, второй, четвертый или шестой купонные периоды в следующие даты: **01.09.2007 г., 01.12.2007 г., 01.06.2008 г., 01.12.2008 г.**

Выкуп облигаций осуществляется по цене, равной номинальной стоимости облигации. Выкуп облигаций осуществляется АСБ «Беларусбанк» в соответствии с правилами Секции фондового рынка ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».

В случае если дата досрочного выкупа выпадает на нерабочий день, досрочный выкуп осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем, по цене равной номинальной стоимости. Проценты на сумму досрочного выкупа за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются.

Для осуществления досрочного выкупа владелец облигаций – юридическое лицо должно подать в АСБ «Беларусбанк» заявление о намерении осуществить такую продажу, которое должно содержать:
- наименование владельца облигаций;
- наименование ценной бумаги;
- количество облигаций, предложенных к досрочному выкупу;
- наименование профессионального участника рынка ценных бумаг, через которого будет осуществляться продажа ценных бумаг;
- согласие с условиями досрочного выкупа, которые изложены в зарегистрированном Проспекте эмиссии облигаций;
- юридический адрес и контактные телефоны заявителя;
- подпись уполномоченного лица.

В случае, если для осуществления досрочного выкупа владельцу облигаций необходимо принятие решения соответствующего органа или получение согласования, или получение разрешения, владелец выкупаемых облигаций обязан заблаговременно принять (получить) данное решение (согласование, разрешение).

Заявление о досрочном выкупе должно быть представлено в АСБ «Беларусбанк» в следующие сроки:

| *Купонный период, после которого осуществляется досрочный выкуп* | *Дата досрочного выкупа* | *Срок предоставления заявления о досрочном выкупе* |
|---|---|---|
| 1 | 01.09.2007 | не позднее 24.08.2007 |
| 2 | 01.12.2007 | не позднее 23.11.2007 |
| 4 | 01.06.2008 | не позднее 23.05.2008 |
| 6 | 01.12.2008 | не позднее 21.11.2008 |

Подача заявлений осуществляется по факсу с последующим предоставлением оригинала на протяжении трех дней, заказным письмом или непосредственно по адресу: 220050, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Мясникова, 32, тел. 200-19-82, факс 222-26-26. Заявления, предоставленные после указанных дат, считаются недействительными.

АСБ «Беларусбанк» имеет право осуществлять выкуп облигаций на биржевом рынке в иные сроки по цене, определяемой АСБ «Беларусбанк».

АСБ «Беларусбанк» имеет право осуществлять дальнейшую реализацию выкупленных облигаций, а также осуществлять с выкупленными облигациями иные действия в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

В случае выкупа всего объема эмиссии облигаций АСБ «Беларусбанк» может принять решение о досрочном погашении выкупленных облигаций.

**15. Срок и порядок погашения облигаций**
При погашении владельцам выплачивается номинальная стоимость облигаций, а также выплачивается доход за последний купонный период (иные неполученные купонные доходы – при их наличии).

Погашение облигаций производится **01.06.2009 г.** на основании реестра владельцев облигаций путем перечисления в безналичном порядке причитающихся денежных средств на счета владельцев облигаций в белорусских рублях, открытые в уполномоченных банках Республики Беларусь. Реестр владельцев облигаций формируется **за 5 рабочих дней до даты погашения облигаций.**

В случае, если дата погашения выпадает на нерабочий день, погашение осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем, по цене равной номинальной стоимости. Проценты на сумму погашения за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются.

В случае отсутствия в реестре владельцев облигаций данных о счетах владельцев облигаций в белорусских рублях, открытых в уполномоченных банках Республики Беларусь, а также в случае, если реестр содержит ошибочные банковские реквизиты, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на счете АСБ «Беларусбанк» до непосредственного обращения владельца облигации. Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.

**16. Условия отказа в продаже облигаций**
В продаже облигаций может быть отказано в случаях, предусмотренных законодательством Республики Беларусь.

**17. Условия и порядок возврата средств инвесторам при запрете продажи облигаций**
В случае отказа от выпуска облигаций АСБ «Беларусбанк» в срок не позднее 30 дней с момента принятия решения об отказе возвращает владельцам облигаций денежные средства, направленные на покупку облигаций, с уплатой процентов за пользование денежными средствами по процентной ставке, равной действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 1,5 (Один целый пять десятых) процентного пункта.

**18. Порядок обращения облигаций**
Обращение облигаций осуществляется среди юридических лиц в установленном законодательством Республики Беларусь порядке через торговую систему ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».

Обращение облигаций прекращается **за 5 рабочих дней** до даты выплаты купонного дохода за каждый купонный период в течение срока обращения облигаций, а также **за 5 рабочих дней** до даты их погашения.

**19. Место и время ознакомления с проспектом эмиссии облигаций**
С более подробной информацией и проспектом эмиссии облигаций можно ознакомиться в центральном аппарате АСБ «Беларусбанк» по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, в филиалах банка в течение рабочего времени.

Председатель Правления АСБ «Беларусбанк» Н.А. Ермакова

Главный бухгалтер АСБ «Беларусбанк» И.П. Лысоковская

**http://www.belarus-bank.by**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 27.10.2006 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. Лицензия № 02200/0247731 на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, зарегистрирована в реестре лицензий Министерства финансов Республики Беларусь 25.04.2007 г. за № 5200-1246-905, срок действия — до 29.07.2007 г.*



ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

**html:** www.zviazda.by **E-mail:** info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».**
**Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.**
**Тыраж 34.693. Індэкс 63850. Зак. № 2929. Нумар падпісаны ў 19.30.**
**М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**
**П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**